ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
17 КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 27 (1477)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

## ДЫЯПАЗОН ДЗЕЯННЯ ПАРТГРУПЫ

**Без перабольшання можна сказаць, што далейшае павышэнне ўзроўню партыйнага кіраўніцтва ў значнай ступені залежыць ад росту баяздольнасці партыйных груп. Кожная з іх павінна стаць паўнамоцным прадстаўніком нашай партыі ў масах, выразнікам яе сілы і палітыкі.**

ВЫВУЧЫЎШЫ стан работы партгруп кафедраў фізічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў, можна зрабіць абагульненне, што партгрупоргі гэтых падраздзяленняў працуюць мэтанакіравана, аператыўна. Разам з тым, маецца шмат нявырашаных праблем, партгрупоргі не валодаюць у поўнай меры арганізацыйнымі пытаннямі.

У Статуце КПСС не вызначаны тэрміны, у якія склікаюцца сходы партгруп, яны праводзяцца па меры неабходнасці. Вывучэнне дакументацыі асобных партгруп універсітэта сведчыць, што гэтую меру неабходнасці партгрупоргі вызначаюць па-рознаму. Калі былы партгрупорг кафедры тэорыі функцый праводзіў адзін сход у год, то зноў выбраны партгрупорг У. А. Габрыновіч бачыць неабходнасць 1 — 2 разы ў месяц праводзіць сходы, што, зразумела, правільна, бо характэрная рыса сходу партгрупы — аператыўнасць. Па асобных пытаннях сходы могуць праводзіцца без падрыхтоўкі.

Прычыну правядзення малой колькасці сходаў партгрупорг тлумачыць тым, што ўсе пытанні кафедры рашаюцца на нарадах у загадчыка кафедры, а партгрупа не хоча іх дубліраваць. Гэта не правільна. Загадчык кафедры не можа замяніць работу партгрупы.

Адной з форм павышэння адказнасці, актыўнасці членаў партгрупы з'яўляюцца іх паведамленні, справаздачы перад таварышамі аб выкананні статутных і функцыянальных абавязкаў.

Практыка паказвае, што такая форма работы дапамагае своечасова падтрымліваць актыўных камуністаў, прапаноўваць неабходную дапамогу, папярэджваць магчымыя памылкі, падказваць, як лепш выканаць тое ці іншае партыйнае даручэнне, дае магчымасць строга спытаць за невыкананне намечанага.

Каго заслухоўваць на партсходзе, калі і па якому пытанню — рашае партгрупорг разам з камуністамі. Важна, каб справаздачы камуністаў не ператварыліся ў кампанію. Яны карысныя тады, калі да іх загадзя рыхтуюцца, ствараюць умовы для зацікаўленай дзелавой размовы. Калі ёсць неабходнасць, стварaецца камісія для глыбокага вывучэння дзейнасці камуніста, каб затым даць правільную ацэнку рабоце. Заслугоўвае ўвагі практыка справаздач саміх партгрупоргаў перад камуністамі ў перыяд паміж справаздачамі і выбарамі. Гэта робіцца на кафедры лічбавых метадаў і праграміравання.

Калі-нікалі можна практыкаваць адначасова справаздачы двух камуністаў, з якіх адзін добрасумленна выконвае патрабаванні Статута, ініцыятыўна, а другі не жадае працаваць у поўную меру. Такая размова дазваляе выхоўваць камуністаў на ўзорных прыкладах.

Вельмі важна ў час справаздачы партгрупоргу зрабіць правільныя вывады, прыняць рашэнне, выкананне якога спрыяла б паляпшэнню становішча спраў.

Напрыклад, на кафедры тэорыі функцый на партсходзе было разгледжана пытанне «Аб рабоце куратараў кафедры на старэйшых курсах». Пытанне важнае, заслуханы справаздачы куратараў, высветлены недахопы, а пастанова не прынята. На кантроль пытанне не ўзялі. Запіс «прызнаць работу здавальняючай» — відавочна недастатковы.

Асабліва хочацца спыніцца на падрыхтоўцы і правядзенні справаздачна-выбарчых сходаў партгруп. Наведваючы іх, вывучаючы пратаколы, неабходна адзначыць, што яны пакуль не адыгрываюць той ролі, якую павінны адыгрываць.

Справаздача аб рабоце партгрупорга — гэта аналіз стану спраў у калектыве. Каб такі аналіз зрабіць, неабходна параўнаць вынікі работы кафедры за некалькі гадоў. Увага партгрупы павінна быць засяроджана на аналізе ўкладу кожнага камуніста ў выкананне партыйных рашэнняў. Чым глыбей такі аналіз, чым больш прынцыповыя ацэнкі, тым мацней гарантыя, што роля камуністаў яшчэ больш узрасце.

Вядзенне дзённікаў — нявырашанае пытанне на многіх кафедрах. Па запісах у дзённіку партгрупорг можа вызначыць актыўнасць камуністаў на партсходах, адносіны да партыйных даручэнняў, ажыццявіць кантроль за выкананнем прымаемых рашэнняў, дабіцца выкаранення недахопаў. Дакладная рэгістрацыя рашэнняў, аднаразовых даручэнняў і адзнак аб іх выкананні дае магчымасць правільна будаваць работу партгрупоргу Г. В. Пірыжняк (кафедра лічбавых метадаў і праграміравання). А вось, напрыклад, на кафедры тэорыі функцый мехмата ніводнага запісу ў дзённіку партгрупорга з 28 красавіка 1983 года па 18 сакавіка 1985 года.

Узрастанне ролі партыйных груп як важнага структурнага звяна пярвічнай партарганізацыі, шырокі дыяпазон і складанасць іх работы ў сучасных умовах прад'яўляюць якасна новыя патрабаванні да партгрупоргаў. Ад актыўнасці, ініцыятывы партгрупорга, яго ўмення арганізаваць работу камуністаў у рашаючай ступені залежыць уздзеянне партыйных груп на справы калектыву.

Н. ГАРДЗЯЮК,
інструктар Маскоўскага РК КПБ
г. Мінска.

Беларускі універсітэт
ТЭЛЕТАЙП
«Учора - сёння - заўтра»

### ПЫТАННІ ПАДРЫХТОЎКІ

інтэрнатаў і вучэбных карпусоў да работы ў зімовых умовах разгледжаны на чарговым пасяджэнні Камітэта народнага кантролю БДУ імя У. І. Леніна. Праверкай, праведзенай КНК, устаноўлена, што асобныя службы адміністрацыйна-гаспадарчай часткі правялі падрыхтоўку да работы ў зімовых умовах не на належным узроўні. За ўпушчэнні ў рабоце КНК вынес строгую вымову галоўнаму энергетыку А. П. Смірнову і галоўнаму механіку М. М. Варанцову.

На пасяджэнні КНК абмеркавана таксама гатоўнасць школ народнага кантролю да новага навучальнага года.

А. КАСПЯРОВІЧ,
старшыня КНК
універсітэта.

### ПЛАН МЕРАПРЫЕМСТВАЎ

па ўзмацненню прапаганды заканадаўства, накіраванага на барацьбу з п'янствам і алкагалізмам у святле Пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па пераадоленню п'янства і алкагалізму» на 1985—1986 навучальны год зацверджаны на пасяджэнні савета па прававому выхаванню і прафілактыцы правапарушэнняў.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### АДБЫЛАСЯ НАРАДА

з работнікамі адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, камендантамі інтэрнатаў, старшынямі прафбюро і старшынямі студсаветаў інтэрнатаў. На ёй прааналізаваны стан падрыхтоўкі інтэрнатаў і вучэбных карпусоў універсітэта да работы ў зімовых умовах. Выказаны крытычныя заўвагі па актывізацыі дзейнасці ў гэтым напрамку.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

### ДНІ ВЫВУЧЭННЯ ПОПЫТУ

дапамогуць работнікам кніжнага гандлю, выдаўцам даведацца, што хоча бачыць пакупнік на паліцах кніжных магазінаў, якую літаратуру, неабходную для вучобы, павышэння прафесійных ведаў, выхавання дзяцей і правядзення вольнага часу, патрэбна перавыдаць. У гэтым годзе дні ўліку попыту праводзяцца Мінскім аблкнігагандлем 17 і 18 кастрычніка.

Пакупнікам кніжных магазінаў будуць прапанаваны спецыяльныя анкеты, куды яны змогуць унесці свае заўвагі аб змесце, мастацкім афармленні, паліграфічным выкананні, фармаце і аб'ёме розных выданняў, канкрэтныя пажаданні аб іх выпуску.

С. ДАШЧЫНСКАЯ,
рэдактар аддзела
прапаганды кнігі
Мінаблкнігагандлю.

**Камсамольцы і моладзь! Нястомна авалодвайце ведамі, культурай, прафесіянальным майстэрствам! Прымнажайце рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя традыцыі партыі і народа!**

*(З Заклікаў ЦК КПСС.)*



*...ДА АДПРАЎЛЕННЯ цягніка заставалася пяць мінут. Рукзакі складзены, чамаданы запакаваны, заняты ў вагонах месцы — можна рухацца ў дарогу. І ўсё ж не стрымаліся дзяўчаты, каб не выйсці яшчэ раз на перон, каб яшчэ раз не акінуць вокам мясціны, стаўшыя такімі дарагімі. Тут праходзіў іх працоўны семестр. Тут яны жылі, працавалі, сталелі... І гэта развітальная ўсмешка — знак вялікай удзячнасці сельгасатраду, які навучыў іх пераадольванню цяжкасцей, уменню сябраваць.*

*Прыйшла пара лекцый, семінараў, падручнікаў. Шмат ужо старанна спісаных старонак у канспектах Ірыны Сушкевіч, студэнткі IV курса факультэта журналістыкі. Яна — выдатніца вучобы. Ірына ўпэўнена, што выдатнікам можа быць кожны студэнт. «Для гэтага патрэбна,— лічыць яна,— проста мець жаданне. А канспект — гэта заўсёды добры дапаможнік і на практычных занятках, а ў час сесіі нагул».*

*А. ВАЛОШЫН.*
*Фота аўтара.*



# У добры шлях!

*ПЕРШЫ КУРС — час надзвычайных адкрыццяў! Не толькі на лекцыях, калоквіумах і семінарах. Новае малодшых у сям'і «альма матэр» чакае паўсюль. У інтэрнаце, дзе даводзіцца самастойна гатаваць, сачыць за парадкам, у вучобе, на якую дзяржава выдзяляе столькі сродкаў. За гэты першы год вучобы трэба шмат спазнаць, пра ўсё даведацца, узброіцца ведамі з арсенала студэнцкага жыцця. Засвоіць не толькі свае правы, але і абавязкі, і строга іх выконваць.*

*З гэтай нагоды рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» вырашыла дапамагчы першакурснікам і адкрыць своеасаблівы ўсенавуч, дзе можна даведацца, якія меры маральнага ўздзеяння могуць прымяняцца да студэнтаў як пры заахвочванні, так і пры спагнанні, які парадак назначэння стыпендыі і шмат іншага, што хвалюе кожнага, хто ўпершыню пераступае парог вышэйшай навучальнай установы. Сёння змяшчаем першую падборку такіх матэрыялаў.*

*Магчыма, у цябе, дарагі першакурснік, узнікнуць нейкія іншыя пытанні. На іх ты зможаш атрымаць адказ, звярнуўшыся ў рэдакцыю па тэлефоне 20-68-27, альбо прыйсці ці напісаць пісьмо на адрас: 220080, г. МІНСК, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, ПАКОЙ 3, РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ».*

*Чакаем тваіх пытанняў!*

# Ідзіце ў нагу з часам

ДАРАГІЯ ПЕРШАКУРСНІКІ! У вашым жыцці пачаўся выключна важны этап: цяпер вы студэнты БДУ імя У. І. Леніна. З гэтага часу лекцыі, семінарскія і лабараторныя заняткі, курсавыя і дыпломныя работы, экзаменацыйныя сесіі, актыўны ўдзел у рабоце студэнцкага навуковага таварыства, грамадскіх арганізацый, спартыўных секцый і калектываў мастацкай самадзейнасці, вытворчая і вучэбная практыкі, напружаная праца ў студэнцкіх будаўнічых атрадах і многае іншае складзе асноўны змест вашага студэнцкага жыцця. Аднак гэты змест будзе няпоўным, калі вы з першых жа дзён знаходжання ва універсітэце не задумаецеся над прынцыповымі пытаннямі станаўлення і як спецыяліста і як асобы. І не толькі задумаецеся, але і пастараецеся правільна з'арыентавацца ў шляхах дасягнення гэтых мэт.

Ва універсітэце створаны ўсе ўмовы для таго, каб вы сталі добрымі спецыялістамі. Шмат залежыць ад вас. Што для гэтага патрэбна? Перш за ўсё навучыцца працаваць. Працаваць на лекцыях і семінарскіх занятках, у бібліятэцы і ў лабараторыі, працаваць самастойна, творча, з поўнай аддачай сіл. Працаваць так, як раіла Н. К. Крупская: «Калі мы хочам вытворча правесці час, мы павінны правільна размеркаваць яго». Навучыцца правільна размяркоўваць час вы павінны з першых крокаў навучання ва універсітэце. Інакш вы нічога не паспееце зрабіць па-сапраўднаму. Помніце, ад таго, якімі будуць вашы першыя крокі ў вучобе, у многім залежыць рытм і поспех вашага далейшага руху да выбранай мэты.

Пачынаецца ваша пяцігадовае падарожжа за ведамі. Вас чакае краіна. Неабходна памятаць і тое, што вам давядзецца заканчваць дваццатае стагоддзе. Ваша дзейнасць будзе праходзіць ва ўмовах далейшага развіцця навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, якая прад'яўляе да кожнага спецыяліста ўсё большыя патрабаванні.

Заўсёды ідзіце ў нагу з часам, будзьце на ўзроўні яго праблем, укладзіце сваю дастойную працу ў паспяховае іх вырашэнне.

**М. ПІСКУНОЎ,**
**загадчык кафедры педагогікі, доктар педагагічных навук, прафесар.**

**ДАВАЙ ЗНАЁМІЦЦА, ПЕРШАКУРСНІК!**

# САМЫ ШЧАСЛІВЫ ЧАЛАВЕК

**У рэдакцыі мне далі заданне: напісаць пра шчаслівага чалавека.**

**— А дзе ж я яго знайду? — вельмі здзіўленая такой прапановай, запыталася я.**

**— У нас ва універсітэце,— адказалі мне.— Ён вельмі, вельмі шчаслівы. І ты адразу пазнаеш яго.**

**Прыхапіўшы з сабой ручку і блакнот, адпраўляюся на пошукі.**

ДЗВЕ ДЗЯЎЧЫНЫ, усміхаючыся адна адной, нешта расказваюць. Радасныя агеньчыкі блішчаць у іх вачах. Відаць, гэта тыя, хто мне патрэбны.

— Дзяўчаты, напэўна, вы самыя шчаслівыя людзі ва універсітэце?

— Ды не,— адказваюць тыя. — Мы ж пяцікурсніцы. Падыходзіць да канца наша вучоба. Набліжаецца час развітання. Шкада пакідаць універсітэт...

Здалёк чуўся звонкі дзявочы голас. Яго падхапіў хор галасоў, і загучала ў паветры песня аб маладосці, міры, дружбе. Гэта байцы аднаго з універсітэцкіх сельгасатрадаў вярталіся ў Мінск. Статныя, вясёлыя. Было б вельмі дзіўна, каб яны не былі шчаслівымі.

— Ці шчаслівыя вы людзі?— пытаюся ў іх.

— Напэўна. Атрад падарыў нам новых сяброў, дапамог паверыць у свае сілы, даў магчымасць добра папрацаваць. І ўсё ж нас засмучае развітанне з працоўным семестрам.

Вось табе. Як жа я выканаю заданне? Трэба ў камітэт камсамола зазірнуць. Можа там што параяць? Падымаюся на трэці паверх. Чытаю: «Пастаноўка на камсамольскі ўлік». І колькі тут юнакоў і дзяўчат!

— Вы ведаеце, сюды прыходзяць самыя шчаслівыя людзі,— незнарок падказваюць мне дзяўчаты, якія працуюць тут за столікамі.

— Не можа быць! Гэта ж першакурснікі. А іх каля дзвюх тысяч! Няўжо столькі шчасліўчыкаў?

Угледзьцеся ўважліва ў твары нашых першакурснікаў. Пасачыце за іх хадою. Нават кожны рух сведчыць аб іх вялікай радасці — яны сталі студэнтамі БДУ імя У. І. Леніна. І каб яшчэ больш пераканацца ў гэтым, я звярнулася да першакурснікаў. Вось што яны адказалі.

## ...І МАРА ЗБЫЛАСЯ

ВУЧЫЦЦА Ў БДУ — мая запаветная мара. І калі ў мінулым годзе не прайшла па конкурсу, усё ж надзею паступіць ва універсітэт не страціла. Да новага паступлення рыхтавалася добра: займалася на падрыхтоўчых курсах, навучылася самастойна працаваць над падручнікам. Першы экзамен здала на выдатна, і тое, што школу закончыла з залатым медалём, дазволіла мне стаць студэнткай філалагічнага факультэта беларускага аддзялення. Мара здзейснілася. Які настрой у мяне? Самы святочны.

Многае ведала пра БДУ імя У. І. Леніна. Але ў маім уяўленні ён быў зусім не такім. Мне здавалася, што студэнт атрымлівае тут толькі абраную прафесію. Але правёўшы ва універсітэце першыя дні, бачу, што памылялася. Бачу, колькі клопатаў прынеслі мы, навічкі. І старшакурснікам, і выкладчыкам. Турбуюцца яны за нас: каб і з жыллём усе добра ўладкаваліся, і каб у гурток мастацкай самадзейнасці запісаліся, і любімым відам спорту займаліся, ад спраў камсамольскіх не былі ў баку. Ну а мы, першакурснікі, пастараемся атрымліваць толькі добрыя і выдатныя адзнакі.

**Галіна МІГНО,**
**студэнтка беларускага аддзялення філалагічнага факультэта.**

## АДЧЫНІЛІСЯ ЗАПАВЕТНЫЯ ДЗВЕРЫ

Я СТАЎ студэнтам юрыдычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Гэта цяжкая і цікавая прафесія вабіла мяне і ў школьныя гады, і ў час вучобы ў Маладзечанскім політэхнічным тэхнікуме, і калі служыў у радах Савецкай Арміі. Пасля службы паступова стаў рыхтавацца да ўступных экзаменаў ва універсітэт. Шмат карысных ведаў атрымаў на вячэрніх падрыхтоўчых курсах, створаных пры БДУ, займаўся самастойна.

Прыйшло доўгачаканае трыццаць першага жніўня. Гэты дзень, напэўна, застанецца назаўсёды ў памяці кожнага першакурсніка. Першым нас, будучых юрыстаў, віншаваў дэкан факультэта В. Г. Ціхіня. Шмат добрых слоў і пажаданняў пачулі мы ў гэты дзень ад выкладчыкаў і старшакурснікаў. І вось урачыстая клятва. У зале раптоўна становіцца ціха, і толькі дзявочы голас парушае гэту цішыню, вымаўляючы словы клятвы: «Клянёмся абранай прафесіі»,— гаворыць першакурсніца, і дзесяткі галасоў падхопліваюць яе. «Клянёмся!» — паўтарае зала.

У руках я трымаю студэнцкі білет і залікоўку. На працягу пяці гадоў яны будуць разам са мною падымацца па прыступках ведаў да абранай прафесіі. Адкрываю залікоўку. Першы семестр. Пакуль што тут пуста. Але і не заўважыш, як надыдзе час сесіі, і як з'явяцца ў ёй першыя адзнакі. Вельмі хацелася б, каб яны былі толькі добрымі і выдатнымі.

**Іосіф СТАНКЕВІЧ,**
**студэнт юрыдычнага факультэта.**

## ЧАС ЗДЗЯЙСНЕННЯ ЖАДАННЯЎ

З ДЗЯЦІНСТВА я марыла стаць настаўніцай. Але, магчыма, спачатку гэта было проста дзіцячай гульнёй. Я любіла садзіць дзяцей, якія былі меншыя за мяне, і вучыць іх. Вельмі падабалася, што я магла расказаць ім нешта новае, чаго яны яшчэ не ведалі.

Хутка мае гульні скончыліся, і мне сур'ёзна давялося сутыкнуцца з прафесіяй настаўніка. У старэйшых класах мне не раз даяралі весці ўрокі матэматыкі ў малышоў. Мне гэта было вельмі цікава і, здавалася, падабалася вучням. У канцы дзесятага класа я цвёрда вырашыла: буду настаўніцай.

І вось я нясу дакументы ва універсітэт. Падаю іх на педагагічнае аддзяленне механіка-матэматычнага факультэта.

31 ліпеня. Мне здаецца, што я нічога не ведаю. А заўтра здаваць матэматыку. Устала раніцой у шэсць гадзін. Хаджу па кватэры і не ведаю, за што ўзяцца. Прыязджаю ва універсітэт, стаю ля дзвярэй аўдыторыі. Калені і рукі дрыжаць. Заходжу, бяру білет, хутка чытаю яго. Пачынаю разумець: мне пашанцавала, трапіў лёгкі білет. Рыхтуюся да адказу. Адчуваю: праходзіць страх. Адказваю. Выдатна. Выскокваю з аўдыторыі. Пяцёрка. Не верыцца, што я ўжо студэнтка.

Не памятаю, як даехала дамоў. Адчыняю дзверы і ўжо з парога крычу:

— Мама, я — студэнтка!

Бацькі вельмі ўзрадаваліся. А мама сказала:

— Паступіць — не самае галоўнае. Самае цяжкае будзе наперадзе.

Мне здаецца, гэта так і ёсць. Патрэбна адразу ж сур'ёзна брацца за справу. Я думаю, што вучоба ва універсітэце будзе цяжкай, але і цікавай.

**Ларыса ЦІМОХІНА,**
**студэнтка механіка-матэматычнага факультэта.**

# СТЫПЕНДЫЯЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ

ПРЫЗНАЧЭННЕ СТЫПЕНДЫІ — стымуляваць вучобу студэнтаў і актыўны ўдзел іх у навукова-даследчай і грамадскай рабоце. Таму ні ў якім разе нельга блытаць стыпендыю з дапамогай па лініі дзяржаўнага сацыяльнага страхавання. За кожным студэнтам савецкі закон замацоўвае права на стыпендыю, якое не залежыць ад яго матэрыяльнага становішча, полу, расы, нацыянальнай прыналежнасці, веравызнання і сацыяльнага паходжання. Рэалізацыя гэтага права залежыць выключна ад самога студэнта.

У першую чаргу права на стыпендыю маюць тыя студэнты, якія здалі экзаменацыйную сесію на «выдатна» і «добра» і актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці калектыву. Для вызначэння найбольш паспяваючых студэнтаў не дазваляецца падлік балаў, якія мелі месца пры паступленні ў ВНУ на вучобу. Атрыманне адной здавальняючай адзнакі не дае студэнту пераважнага права на стыпендыю нават пры ўмове атрымання па астатніх дысцыплінах выдатных адзнак. Адзнака па дыферэнцыраванаму заліку прыраўноўваецца да экзаменацыйнай. Не ўлічваюцца толькі факультатыўныя адзнакі.

Студэнт — актыўны грамадскі работнік, які атрымаў хоць адну здавальняючую адзнаку па выніках экзаменацыйнай сесіі, таксама не мае першачарговага права на атрыманне стыпендыі. Таму часам няправільна паступаюць дэканы, «знаходзячы» такім студэнтам стыпендыю за кошт здаўшых сесію на «добра» і «выдатна» і выконваючых разавыя грамадскія даручэнні або зрабіўшых разавыя нязначныя парушэнні дысцыпліны. Першым абавязкам студэнта з'яўляецца якасная вучоба. Грамадская работа павінна дапаўняць вучобу, павышаць асабістую адказнасць студэнта за якасць вучобы, але не падмяняць яе.

Студэнтам, якія атрымалі па выніках сесіі адну або некалькі здавальняючых адзнак, назначаецца стыпендыя ў апошнюю чаргу, гэта значыць пасля поўнага стыпендыяльнага забеспячэння студэнтаў, што не маюць па выніках сесіі здавальняючых адзнак. З гэтага правіла зроблена выключэнне для асобных катэгорый студэнтаў.

Сярод студэнтаў нярэдка паўстаюць пытанні, ці ўлічваецца матэрыяльнае становішча пры назначэнні на стыпендыю? Як быць сямейным студэнтам, у якіх ёсць дзіця, ці можна з-за «выпадковай» тройкі пазбаўляць іх стыпендыі? Як быць тым, каму бацькі не ў стане дапамагчы матэрыяльна і стыпендыя для іх — адзіная крыніца для існавання?

Дзеючае заканадаўства не забараняе ў асобных выпадках улічваць матэрыяльнае становішча студэнта, хаця як фактар матэрыяльнае становішча студэнта пры назначэнні стыпендыі, зразумела, павінна быць улічана, але толькі не на шкоду паспяховасці або грамадскай рабоце іншых студэнтаў. Калі ж пры ўсіх магчымых варыянтах яму не можа быць назначана стыпендыя, рэктар мае права аказаць такому студэнту разавую матэрыяльную дапамогу памерам не вышэй звычайнай месячнай стыпендыі. Пры гэтым патрэбна мець на ўвазе, што права на матэрыяльную дапамогу не залежыць ад удзелу ў грамадскай рабоце і аказанне яе толькі студэнтам, якія не атрымліваюць стыпендыі, будзе няправільным.

Стыпендыі студэнтам (акрамя тых, каму яны выплачваюцца накіраваўшымі іх на вучобу прадпрыемствамі, арганізацыямі) назначаюцца дэканам факультэта па прадстаўленню стыпендыяльных камісій факультэта ў межах стыпендыяльнага фонду, устаноўленага факультэту рэктарам ВНУ.

Назначэнне стыпендыі праходзіць два разы ў год па выніках экзаменацыйных сесій з першага чысла наступнага за сесіяй месяца.

Нягледзячы на калегіяльнае абмеркаванне пытання аб назначэнні стыпендыі студэнтам, дэкан нясе асабістую адказнасць за правільнае размеркаванне стыпендыяльнага фонду факультэта. Па закону стыпендыяльная камісія толькі рыхтуе дэкану факультэта матываванае пісьмовае прашэнне аб неабходнасці назначэння стыпендыі канкрэтным студэнтам. Пагадзіцца з думкай камісіі ці не — права дэкана. Спіскі студэнтаў, назначаных на стыпендыю дэканам факультэта, зацвярджае рэктар вышэйшай навучальнай установы.

Студэнтам - першакурснікам стыпендыя ў першым семестры назначаецца па выніках уступных экзаменаў, але без уліку сярэдняй арыфметычнай адзнакі па атэстату.

Па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі стыпендыя назначаецца і выплачваецца з 1 лютага. Таму за студэнтамі, якія атрымалі стыпендыю ў першым семестры навучальнага года, права на яе захоўваецца да студзеня (уключна) нават пры ўмове атрымання ў перыяд сесіі (у студзені) нездавальняючай адзнакі.

# Правы і абавязкі студэнта

**СТУДЭНТЫ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ МАЮЦЬ ПРАВА:**

— карыстацца бясплатна лабараторыямі, кабінетамі, аўдыторыямі, чытальнымі заламі, бібліятэкамі, падлікова-вылічальнымі і вучэбна-дапаможнымі ўстановамі, а таксама спартыўнымі базамі, збудаваннямі, спартыўным інвентаром і іншым абсталяваннем вышэйшай навучальнай установы;

— удзельнічаць у навукова-даследчай рабоце, якая арганізуецца вышэйшай навучальнай установай і навуковым студэнцкім таварыствам;

— удзельнічаць праз грамадскія арганізацыі ў абмеркаванні пытанняў удасканалення вучэбнага працэсу, ідэйна-выхаваўчай работы, а таксама пытанняў паспяховасці, працоўнай і вучэбнай дысцыпліны студэнтаў, назначэння стыпендый, размеркавання месц у інтэрнатах — іншых пытанняў, звязаных з вучобай і бытам студэнтаў.

Студэнты ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці калектыву вышэйшай навучальнай установы, у рабоце спартыўных секцый, таварыскіх і навукова-тэхнічных гурткоў, у мастацкай самадзейнасці.

Студэнты пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы атрымліваюць работу па спецыяльнасці.

**СТУДЭНТЫ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ АБАВЯЗАНЫ:**

— сістэматычна і глыбока аваладваць тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі па выбранай спецыяльнасці;

— аваладваць марксісцка-ленінскай тэорыяй і павышаць свой ідэйна-палітычны, навуковы і культуры ўзровень;

— набываць навыкі арганізацыі масава-палітычнай і выхаваўчай работы;

— наведваць абавязковыя вучэбныя заняткі і выконваць у вызначаныя тэрміны ўсе віды заданняў, прадугледжаныя вучэбным планам па праграмах;

— актыўна ўдзельнічаць у грамадска карыснай працы;

— захоўваць прынцыпы камуністычнай маралі;

— выконваць правілы ўнутранага распарадку вышэйшай навучальнай установы і студэнцкага супольнага жыцця.

Студэнту вышэйшай навучальнай установы, які здаў экзамены з адзнакай «выдатна» не менш чым па 75 працэнтах усіх дысцыплін вучэбнага плана, а па астатніх дысцыплінах — з адзнакай «добра» і абараніў дыпломны праект (работу) або здаў дзяржаўныя экзамены з адзнакай «выдатна», а таксама праявіў сябе ў навуковай і грамадскай рабоце, выдаецца дыплом з адзнакай.

Атрымаўшы дыплом з адзнакай карыстаецца перавагай пры размеркаванні на работу.

# Без папраўкі на непагадзь

**ВЯСКОВЫ СЕМЕСТР**

НЕЗВЫЧАЙНА шчодрымі на ападкі, нявецліва хмурымі выдаліся верасень і кастрычнік у гэтым годзе. Рэдкі дзень з тых, што правялі ў Круглянскім раёне больш за 600 студэнтаў гістарычнага і філалагічнага факультэтаў БДУ ім. У. І. Леніна, быў сонечным.

...Дождж мы прывезлі са сталіцы, як сказалі сустракаўшыя нас на станцыі Талочын кіраўнікі раёна і прымаючых арганізацый, калі пад гукі духавога аркестра і густога дажджу электрапоезд спыніўся ля перона. Сустрэча была нядоўгай. Першы сакратар РК КПБ М. А. Казючыц заклікаў студэнтаў унесці дастойны ўклад ва ўборку ўраджаю.

Паміж універсітэтам і раёнам даўно склаліся моцныя і надзейныя сувязі, што, безумоўна, садзейнічала хуткаму і аператыўнаму вырашэнню шматлікіх арганізацыйных пытанняў. Сярод іх самае галоўнае — абавязковае захаванне байцамі сельгасатрадаў правілаў тэхнікі бяспекі. Яшчэ да прыезду на месца дыслакацыі студэнты былі азнаёмлены з прыёмамі вядзення работ, але перад выхадам на поле яшчэ не раз слухалі такую неабходную для іх інфармацыю. Асобая ўвага была звернута на аўтаперавозкі.

У першыя дні работы сумесна з райкомам камсамола раённы занальны штаб праводзіў рэйд, а ў сярэдзіне рабочага перыяду — дзень спынення атрадаў, у ходзе якога правяраліся веды і выкананне вытворчых законаў, якія забяспечвалі ахову здароўя і жыцця кожнага работніка.





Не менш увагі ўдзялялася і пытанням арганізацыі быту, харчавання.

Кругляншчына — край пераважна льнаводчы, амаль у кожнай гаспадарцы, дзе працавалі сельгасатрады, лён — асноўная культура, яго па праву лічаць багаццем тутэйшых калгасаў і саўгасаў. Студэнты, якія ўжо пабывалі на палях Круглянщчыны, не гаварылі, што едуць «на бульбу». Іх чакала іншая спецыялізацыя.

У гэтым годзе студэнты, стаўшы на месяц ільнаводамі, спазналі ўсе цяжкасці працаўнікоў вёскі. Частыя дажджы прыбілі лён да зямлі, у многіх месцах ён зарос травой, што значна ўскладніла яго ўборку.

...Наколькі радуе вока асенняе льнянае поле ў сонечныя дні, настолькі хмурна выглядае яно ў непагадзь. Начны дождж прамачыў лён, рукі, што падымаюць яго, мерзнуць ад холаду, а тут яшчэ хмары, якія, здаецца, навіслі над самай галавой, пагражаюць апаласнуць непрыемным душам. Гэтыя прыкметы сёлетняй восені добра вядомыя байцам сельгасатрадаў-85.

Падняць лён, звязаць яго ў снапы, саставіць у бабкі, а калі патрэбна і пагрузіць — вось асноўныя аперацыі, якія выконвалі выхаванцы універсітэта. Патрэбна сказаць, што працавалі яны з агеньчыкам, ініцыятывай, бераглі час.

У першыя ж дні ва ўсіх атрадах прайшлі камсамольскія сходы, дзе абмяркоўваліся шляхі павышэння якасці і эфектыўнасці ўборачных работ, прымаліся сацыялістычныя абавязацельствы. Працоўная вахта, прысвечаная 50-годдзю стаханаўскага руху, прадэманстравала, што ў студэнтаў словы не разыходзяцца са справай. Ні ў адным з калгасаў і саўгасаў у адрас байцоў ССГА не было сказана слоў дакору і сур'ёзнай крытыкі.

Як і ў мінулым годзе, лідэрства ў сацыялістычным спа-



борніцтве атрадаў Круглянскай зоны захапілі «Рамантыкі», якія працавалі ў калгасе «Шлях Леніна». Упершыню ў састаў атрада ўвайшлі студэнты двух факультэтаў, якія штогод змагаюцца за права заваяваць запаветную ўзнагароду — пераходны Чырвоны сцяг РК КПБ, раённага Савета народных дэпутатаў. Магчыма, гэта і стала прычынай асобай вастрыні спаборніцтва паміж брыгадамі. Важкія вынікі іх працы: за першыя тры тыдні паднята льнотрасты больш чым са 120 гектараў, звязана каля 70 тысяч снапоў, выкананы іншыя работы. Асаблівых поспехаў дасягала звяно Алы Варабей, якая сама выконвала нормы больш чым на 150 працэнтаў.

Байцы сельгасатрада «Рамантыкі» звярнуліся да ўсіх атрадаў раёна з заклікам выконваць дзённыя нормы на 110 працэнтаў з добрай якасцю работ, максімальна выкарыстоўваць час, зрабіць дасягненні перадавікоў нормай кожнага і дабіцца поўнага выканання вытворчых дагаворных абавязацельстваў. На камсамольскіх сходах іншыя сельгасатрады абмеркавалі і падтрымалі ініцыятыву студэнтаў трэцяга і чацвёртага курсаў гістарычнага і першага курса філалагічнага факультэтаў.

Не адставаў ад «Рамантыкаў» і атрад «Філолаг», які працаваў на палетках саўгаса «Шапялевічы», хоць яго байцам даводзілася выконваць большую разнавіднасць работ: падымаць і вязаць лён, збіраць бульбу за капалкай, працаваць на бульбаўборачным камбайне і збожжатаку. Студэнты трэцяга курса філфака мелі дачыненне нават да пасяўной. Пасля работы, калі атрад адпачываў, кіраўніцтва гаспадаркі звярнулася з просьбай дапамагчы падрыхтаваць зерне да сяўбы. Нягледзячы на стомленасць, дзяўчаты з «Філолага» адгукнуліся на просьбу, і 15 тон зерня было затарана ў мяхі. Па-ўдарнаму працавалі на збожжатаку саўгаса «Цяцерына» і студэнты першага курса аддзялення палітэканоміі: староста групы Глеб Максімовіч, Ігар Матросаў, Андрэй Грачнеўскі і іншыя.

Кіпела работа і ў «Лянка» (атрад працаваў у калгасе «Свабода»). Першакурснікі аддзялення беларускай мовы і літаратуры ўмела і старанна падымалі і вязалі лён. Вынікі работы — больш за 100 тон убранага льну — гавораць самі за сябе. Дзяўчаты таксама выступілі з канцэртам перад жыхарамі вёскі Грыбіна, арганізавалі шэфскую дапамогу мясцовай школе.

Напружаны рытм жыцця студэнцкіх сельскагаспадарчых атрадаў садзейнічаў рознабаковай грамадска-палітычнай дзейнасці. У актыве атрадаў — гутаркі, сустрэчы з цікавымі людзьмі, конкурсы, канцэрты, спартыўныя спаборніцтвы. Асобай увагай і клопатам былі акружаны ветэраны вайны і працы, сем'і загінуўшых воінаў. Словам, непрыемнасці, звязаныя з непагодай, не зніжалі працоўнай актыўнасці і творчага напалу жыцця студэнтаў.

**А. ЯНОЎСКІ,**
камандзір Круглянскага занальнага штаба сельгасработ;
**Г. ЮРЧАНКА,**
камісар Круглянскага занальнага штаба сельгасработ.



РЭХА ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

# «МІНСК-85»





ТРАДЫЦЫЙНЫ інтэрнацыянальны СБА «Мінск», які штогод фарміруецца ў БДУ імя У. І. Леніна для работы ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы, і гэтым летам аб'яднаў 20 студэнтаў, прадстаўнікоў розных факультэтаў універсітэта.

Атрад быў раздзелены на тры брыгады. Група дзяўчат працавала ў Батанічным садзе, другая — укладвала бардзюры ўздоўж дарожак гэтага ж сада. Асноўным аб'ектам атрада з'яўляўся Вылічальны цэнтр Йенскага універсітэта, дзе патрэбна было правесці рэстаўрацыйныя работы: зняць з фасада будынка ўсе металічныя дэталі, ачысціць іх ад іржы, загрунтаваць і зноў манціраваць на сцены. Усе брыгады выдатна справіліся з аб'ёмам сваіх работ, а група, якая працавала на Вылічальным цэнтры, атрымала прэмію. На заключным сходзе атрада, дзе падводзіліся вынікі, аднадушна вырашылі ўзнагародзіць байцоў брыгады значком «Ударнік СБА».

Надоўга ў памяці кожнага байца застануцца паездкі па ГДР пасля работы. Велічныя палацы Патсдама, Сан-Сусі, Дрэздэнская галерэя, музеі і помнікі старажытнасці... Вялікае ўражанне пакінула наведванне месц баявой славы савецкага народа. Рэдкія, але гордыя абеліскі. Надпісы амаль на кожным музеі: «Праверана, мін няма. Правяраў Хануцін». Але асабліва ўразіў помнік савецкаму воіну-вызваліцелю ў Берліне.

А. ВАЛОШЫН,
наш кар, баец атрада.

**НА ЗДЫМКУ:** брыгада, якая працавала на Вылічальным цэнтры Йенскага універсітэта, выканала неабходны аб'ём работ якасна і ў значна карацейшы тэрмін, чым планавалася. Душой брыгады быў камісар Юрый Позняк; малярныя і мантажныя работы на будаўнічых рыштаваннях выконвалі толькі хлопцы; «Мы — з СССР! Мы — з Мінска. А ты ведаеш, што такое СБА?» (Значок на памяць нямецкім хлопчыкам); атрад «Мінск-85» перад адпраўкай... дамоў.

Фота аўтара.





ВОДНЫ ТУРЫЗМ

## Выпрабаванне Карпатамі

ВОСЬ УЖО ДЗЕВЯЦЬ гадоў існуе ў БДУ імя У. І. Леніна секцыя воднага турызму. За гэты час умацавана матэрыяльная база, назапашаны багаты вопыт, за плячыма — унікальныя па прыгажосці і складанасці маршруты: Катунь, Іркут, Саянская Ака... Надышоў час перадаваць традыцыі і свой «почырк» маладым — рыхтаваць новае, другое пакаленне турыстаў-воднікаў. Цудоўныя магчымасці для гэтага даюць нам рэкі Карпат. «Трэніровачным палігонам» на гэты раз быў выбраны Чорны Чарамош.

Дзве універсітэцкія групы ў саставе 16 чалавек (у асноўным супрацоўнікі СКТБ з ВВ і НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі) прайшлі гэты цікавы і даволі складаны маршрут. За дзесяць дзён пераадолена 25 парогаў, мноства шывер і перакатаў. Паўтараметровыя валы, якія захлiсталі плыт, у спалучэнні з падводнымі каменнямі і моцнымі прыцiскамі не былі рэдкасцю. Усё гэта патрабавала ад удзельнікаў добрай тэхнікі, адладжанасці экіпажаў і зайздроснай прысутнасці духу. «Навічкі» з гонарам вытрымалі ўсе выпрабаванні, а «ветэраны», якія дадаткова прайшлі яшчэ і Белы Чарамош (раку з элементамі 4-й катэгорыі складанасці), зноў пацвердзілі свой высокі клас.

Наперадзе новыя маршруты. Але надоўга застануцца ў памяці вясёлкі над парогамі, непаўторнай прыгажосці горы, зарослыя цёмна-зялёнымі «смерычкамі» і цісам, снежная вяршыня Гаверлы. У сэрцы застануцца Карпаты — край легендарных плытагонаў і ўмелых майстроў, край мужных, добрых і гасцінных людзей.

А. СВЯТАШАЎ,
малодшы навуковы супрацоўнік
НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі.

ФЕЛЬЕТОН

# БУДЗЬЦЕ ЗДАРОВЫ!*

ЗДАЕЦЦА, ЯШЧЭ нядаўна людзі зразумелі, што круглае лягчэй каціць, чым квадратнае і вынайшлі такім чынам кола. Тым часам ужо глядзіш, дарогай з «нулёўкі» дадому два яе наведвальнікі ў сяброўскай спрэчцы стараюцца высветліць, што лепш: сінхрафазатрон ці кваркі? Аб чым казаць, часы цяпер не тыя...

Але грэшнай справай не-не ды закрадзецца ў галаву думка. Маўляў, а ці не мог бы гэты самы яго Вялікасць Прагрэс у свой час больш імкліва мкнуць да вяршыні сваёй урачыстасці. Каб зараз, што не матаролер, то з «перпетуум мобіле». А машыны часу — з-за састарэласці канструкцыі спісалі з НДІ і перадалі ў залы ігральных аўтаматаў.

І на самой справе! Узяць хаця б тыя машыны часу. Вынайшаў, скажам, стагоддзе назад нейкі вучоны муж новы веласіпед. Перш чым спешна ўкараняць рацраспрацоўку ў серыйную вытворчасць — сеў у мяккае крэсла машыны часу і націснуў на чырвоную кнопачку з надпісам: «Катапульта на паўвека ўперад». Шлёпнуўся канструктар на плошчы невядомага яму сваёй навізной горада, аж там, бацюхны мае, усе на старых веласіпедах ездзяць, а пра ўкараненне рацыяналізацыі ніхто і не дбае. Каму ахвота руль з педалямі месцамі мяняць! Усе зыходзяць з таго, як прасцей і зручней.

Вернецца такі вучоны-небарака ў сваю «творчую лабараторыю», запакуе вопытны ўзор выніку сваіх пакут і знаходак у скрыню, гукне ў расчыненае вакно рамізніка, ды папросіць таго пачціва:

— Адвязі, шаноўны, гэты падарунак нашаму цырку і ўручы асабіста ў рукі клоуну Фядзюнчыку. На такіх веламашынах у наступным стагоддзі ў цырку ездзіць не стануць!

Вось так. Колькі недарэчнасцей пазбегла б чалавецтва ў сваім развіцці! Успрыняць свядомасцю немагчыма, асабліва зараз,у час бурнай НТР.

З другога боку — свае цяжкасці. Тое, што сёння з'яўляецца відавочным, заўтра можа здацца неверагодным, інакш кажучы — недарэчным. Гэту парадаксальнасць можна падмацаваць тэарэтычнымі выкладкамі наступнага плану.

Усе мы яшчэ ў школе пазнаёміліся з дарвінскай тэорыяй эвалюцыі і паходжання відаў, і яшчэ насілі паўзуны, а ўжо ведалі, што людзей не ў капусце знайшлі — яны пайшлі з малпаў. Шляхам практычнага ажыццяўлення вышэй памянёнай тэорыі. З гэтым, як кажуць, няма праблем, тут дзядуля Дарвін быў абсалютна правы. Адно толькі «але» існуе... Вось тут бы калумбу тэорыі эвалюцыі і паходжання відаў у самы раз спатрэбілася машына часу.

Уявім сабе, як націснуў бы стары на клавішу з адметкай «1985 год, верасень» і праз імгненне мякка катапультыраваўся на пасадачную пляцоўку аўтобуснай станцыі «Аўтазавод», што ў горадзе Мінску. Убачанаму на ўласныя вочы Дарвін мог бы і не паверыць. Бо на адной са шматлікіх лавак, прызначаных для адпачынку і чакання прыгарадных аўтобусаў, наклаўшы пад галаву кулак, спаў яго калега — «муж ад навукі» — намеснік загадчыка аддзела арганізацыі і ўкаранення навукова-тэхнічных работ НДЧ Белдзяржуніверсітэта У. Харытоненка. Ды не проста спачываў пасля паўнакроўнага працоўнага дня, а знаходзіўся ў «становішчы, якое абражае чалавечы гонар»... Гэта работнікі міліцыі тут жа засведчылі запісам у спецыяльным дакуменце з кароткай назвай «Акт» з адначасовым уручэннем У. Харытоненку адпаведнага накіравання ў ашчадкасу для ўплаты штрафу.

«Ат, прымроілася».— Мог бы рэзюміраваць гэты факт Дарвін. Але калі б убачыў, як пад белыя рукі стройныя хлопцы з чырвонымі павязкамі павялі ў кірунку медвыцвярэзніка спачатку А. Прымаку, інжынера кінафоталабараторыі, а ўслед за ім М. Іванова, работніка адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, дзядулю-вучонага начаі б моцна мучыць сумненні. І апошняй кропляй у перапоўненай абурэннем свядомасці была б сустрэча на пероне вакзала «Мінск-пасажырскі» са студэнтам IV курса геафака В. Кляняцічам, якога відавочна хістала з боку ў бок, хаця надвор'е было ціхае, бязветранае, і землятрус ніводны датчык не фіксаваў.

Вярнуўшыся ў сваё дзевятнаццатае стагоддзе, моцна б прызадумаўся вялікі біёлаг, пераглядаючы рукапісы неабнародаванага яшчэ даследавання. І, магчыма, на палях зрабіў бы прыпіску. Маўляў, у працэсе эвалюцыі могуць назірацца атавістычныя адхіленні, нехарактэрныя для агульнага працэсу. Так, асобныя індывіды з нізкім узроўнем свядомасці і ўнутранай культуры будуць рабіць спробы з дапамогай пітва, якое ўтрымлівае значны працэнт «спіртуса віні», дасягнуць стану, з якога не адно тысячагоддзе выходзілі іх далёкія-далёкія прапродкі. У адносінах да такіх прадстаўнікоў трэба трымаць вуха востра. Заключацца гэта павінна не толькі ў неадкладным памяшчэнні іх у спецмедустановы альбо фінансавых спагнаннях. На працы ўсе свядомыя члены калектыву абавязаны стварыць непрымірымыя адносіны да асоб, якія наўмысна тармозяць працэс эвалюцыі чалавечага грамадства. Калі і гэта не дапаможа — пажадаць ім: «Будзьце здаровы!» і развітацца без выплаты выхадной дапамогі...

Шкада ўсё ж, што чалавецтва зацягнула з вынаходніцтвам машыны часу. Можа тады і не прыйшлося б пісаць гэты фельетон.

В. ПЯРУН.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

17 кастрычніка 1985 г.
Зак. 2877. АТ 13761.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.